ЖУРАВІНАВЫЯ НАПЕВЫ

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: **4.** Едзеш на дзень — хлеба бяры на ... (прык.). **9.** «Прадае ... журавіны // Ў кошыку з бяросты залатой». З верша А. Ляўковіч «Журавіны». **10.** Раённая газета (разм.). **12.** «Журавіны бяруць ..., // імі ўсыпана ўсё Палессе». З верша Э. Акуліна «Журавіны бяруць ...». **15.** Вадзяны арэх; рагульнік. **17.** Высокае стаячае люстра. **18.** ... — здароўя вытокі (прык.). **19.** Засеянае поле. **22.** ... цвіце — пах добры, вішня цвіце — вачэй не адарваць (японская прык.). **23.** Дэталь хадавога механізма гадзіннікаў. **28.** «І ... ёсць на рынку, // А жаданага — наўрад! // Я купіў бы журавінку — // Прапануюць вінаград». З верша Р. Крушыны «Журавіны». **30.** «Аб чым, скажы, спяваюць ..., // Калі так ярка свецяць журавіны?». З верша Л. Кухарэвіч «Аб чым спяваюць журавы?». **32.** Горад на Брэстчыне, дзе, як і ў Мёрах (Віцебшчына), адзначаюць свята журавін. **33.** «Цераз ... — вінаград // Пагнала цялятка. // Туды маё сэрца рвецца, // Дзе мілога хатка». Прыпеўка.

ПА ВЕРТЫКАЛІ: **1.** «Дзяўчына — сардэнька, // Выйдзі пад акенка, // Прынясе хлапчына // ... красненька». Прыпеўка. **2.** «Расце мак — пастарнак // І цыбуля — дынька. // Мой ... — гаспадар, // А я — гаспадынька». Прыпеўка. **3.** Вузкая палоска неўзаранай зямлі паміж палеткамі. **5.** У чужым баку ... па кулаку (прык.). **6.** ... не хлеб, а ягада не трава (прык.). **7.** ... на стале — здароўе ў доме (прык.). **8.** Буйная жывёліна з доўгай поўсцю. **11.** Бацькі елі журавіны, а ў дзяцей ... на зубах (прык.). **13.** Народная назва багульніку балотнага, які расце звычайна побач з буякамі і журавінамі. **14.** «Чырвоная ... на купінцы спее. // Адзін мяне пацалуе, // А чатыры млее». Прыпеўка. **16.** «Сярод бору ды калінка — ... . // Куды едзеш, мая журавінка?». З беларускай народнай песні «Сярод бору». **17.** Тое, што і трыножак (разм.). **20.** Аб'ём кнігі ў аркушах. **21.** Якая ягада — такое і ... (прык.). **24.** Франтон двухскатнага даху. **25.** «... сее кавуны, а я — журавіны». З беларускай народнай песні «Стаіць ... на гары». **26.** Вузкая палоска, лінія. **27.** «У паветры ... // Ад іх носіцца, // Сама ягада // У рот просіцца». З паэмы Я. Коласа «Міхасёвы прыгоды» («Ягады»). **29.** Першую ягадку ў ... кладуць, а другую дамоў нясуць (прык.). **31.** Слова, якое выражае пачуццё захаплення.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,
г. Дзяржынск.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:

Па гарызанталі: 4. Два. 9. Бабурка. 10. «Рабінка». 12. Жаўчынкі. 15. Чырлім. 17. Трумо. 18. Сокі. 19. Ніва. 22. Сліва. 23. Анкер. 28. Чарнілы. 30. Журавы. 32. Сторгін. 33. Сад.

Па вертыкалі: 1. Ябырка. 2. Мук. 3. Мяка. 5. Вочы. 6. Грыб. 7. Мёд. 8. Як. 11. Аскома. 13. Кланоўнік. 14. Жураўінка. 16. Малінка. 17. Трыногі. 20. Лістак. 21. Варэнне. 24. Шыт. 25. Яка. 26. Рыса. 27. Пах. 29. Рот. 31. Ух!

СЁННЯ

Месяц

Апошняя квадра 3 верасня.
Месяц у сузор'і Дзевы.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.30	19.44	13.14
Віцебск —	6.18	19.35	13.17
Магілёў —	6.20	19.34	13.14
Гомель —	6.18	19.29	13.11
Гродна —	6.45	19.58	13.13
Брэст —	6.48	19.57	13.09

Імяніны

Пр. *Наталлі, Віктара, Георгія, Дзмітрыя, Пятра, Рамана.*
К. *РАСТВО НАЙСВЯЦЕЙШАЙ БОЖАЙ МАЦІ. Адрыяны, Марыі, Серафімы, Нестара, Тамаша.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

8 ВЕРАСНЯ

У краіне

1938 год — нарадзіўся Анатоль Грачанікаў (в. Шарпілаўка Гомельскага раёна), выдатны беларускі паэт. Аўтар зборнікаў «Грыбная пара», «Планета дзяцей», кнігі вершаў «Зоркі і курганы» (на рускай мове) і інш. Яго вершы, пакладзеныя на музыку беларускімі кампазітарамі І. Лучанком, У. Буднікам, Г. Вагнерам, сталі вядомымі песнямі, сярод іх: «Дударыкі», «Белая лілея», «Над Белай Руссю — белы снег...». Выступаў як перакладчык, літаратурны крытык і публіцыст. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, прэміі Ленінскага камсамола Беларусі. Памёр у 1991 годзе.

1973 год — была перакрытая рака Вілія і створана самае вялікае ў Беларусі штучнае Вілейскае вадасховішча.

У свеце

Міжнародны дзень салідарнасці журналістаў. Праводзіцца па рашэнні IV кангрэса Міжнароднай арганізацыі журналістаў (МАЖ), які адбыўся ў маі 1958 года ў Бухарэсце ў памяць аб чэшскім журналісце Юліусе Фучыку, які быў пакараны смерцю гітлераўцамі 8 верасня 1943 года.

1380 год — адбылася Кулікоўская бітва, вынікам якой стала перамога рускіх войскаў на чале з вялікім князем маскоўскім Дзмітрыем Іванавічам (Данскім) над войскамі Залатой Арды на чале з яе кіраўніком Мамаем.

1522 год — завяршылася першае кругасветнае плаванне экспедыцыі Фернанда Магелана, якая даказала шарападобнасць Зямлі і наяўнасць адзінага Сусветнага акіяна.

1843 год — нарадзіўся Дзмітрый Мікалаевіч Анучын (1843—1923), рускі этнограф, антраполаг, географ, акадэмік, ганаровы член Расійскай АН (1898), прафесар. З 1885 года ўзначальваў кафедру геаграфіі ў Маскоўскім універсітэце. Удзельнік экспедыцый да вытокаў Дняпра і Заходняй Дзвіны. Аўтар прац па пытаннях узнікнення беларускай народнасці, вызначэння беларускай тэрыторыі. Упершыню абагульніў антрапаметрычныя даныя пра беларусаў.

1914 год — падчас Першай сусветнай вайны рускі лётчык П. М. Несцераў упершыню ў свеце ўжыў паветраны таран у баі, коштам уласнага жыцця знішчыўшы самалёт праціўніка.

1923 год — нарадзіўся Расул Гамзатаў (1923—1998), аварскі паэт, грамадскі дзеяч, народны паэт Дагестана. Аўтар паэтычных зборнікаў «Год майго нараджэння», «Пацеркі гадоў» і іншых. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.

УСМІХНЕМСЯ

— Вой, дзяўчаты, а мы з мужам учора па вашай парадзе забаўляліся ролевай гульнёй: я была злым паліцэйскім, а ён — злачынцам.

— Ну, і як?

— Тры рабры, два зубы, і ён прызнаўся, што ходзіць налева!

Парады аўтамабілістам.

1. Калі вы хочаце, каб машына не награвалася на сонцы, стаўце яе ў цень.

2. Калі вы хочаце, каб шыны менш зношваліся, менш ездзіце.

3. Калі вы не хочаце траціцца на рамонт машыны, не купляйце яе.

— Софа, а што гэта ты больш не носіш свой пояс для пахудзення?

— Не налазіць.

Люблю пернікі. Асабліва з гарэлкай. Асабліва без пернікаў.

Разумную і разважлівую, пажыццёвую сяброўку маю Таццяну Іванаўну Савенку са Жлобіна шчыра віншую з прыгожай круглай датай! Зычу ў гэты дзень самых прыемных уражанняў, ва ўсе іншыя — здароўя, бадзёрасці і сілы. На ўсё.

Соф'я Кусянкова.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3256. Нумар падпісаны ў 19.30 7 верасня 2018 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12